# САРДЭЧНА ВІНШУЕМ!

**М. М. Касых і П. Т. Дземчанка — ганаровыя грамадзяне горада Гомеля**

**За ратныя подзвігі на франтах грамадзянскай і Вялікай Айчыннай воинау, вялікі уклад у пасляховае ажыццяўленне адной з важных аперацый Вялікай Айчыннай ванны па вызва-ленню Белерусі і горада Гомеля, актыўную дзейнасць па патрыятычнаму выхаванню насельніцтвэ прысвоіць тав. КАСЫХ Міхаілу Макаравічу званне «Ганаровы грамадзянін горада Гомеля».**

**За ратныя подзвігі на франтах Вялікай Айчыннай вайны, шматгадовую самааддануюпрацу, вяпікую грамадска-палітычную работу сярод насепьніцтва прысвоіць тав. ДЗЕМЧАНКУ Пят Трафімавічу званне «Ганаровы грамадзянін горада Гомепя».**

**Уручыць тав. Касых М. М. і тав. Дземчанку П. Т. Дыпломы ганаровага грамадэяніна горада Гомеля, стужкі Гонару і занссці ў Кнігу ганаровых грамадзян горада. 3 рашэння выканкома гарадскога Савета народных дэпутатаў.**

Міхаіл Макаравіч Касых нарадзіўся ў 1903 годзе ў сяле Асятроўка Варонежскай губерні ў сям'і селяніна.

У 1918 годзе добраахвотнікам уступіў у рады Чырвонай Арміі. Удзельнік грамадзянскай вайны. У 1919 годзе стаў членам Камуністычнай партыі. Пасля заканчэння грамадзянскай вайны прымаў удзел у падаўленні контррэвалюцыі.

У 1924 годзе закончыў 1-ю аб’ядиаеую ваенную школу, быў накіраваны для праходжання службы ў Веларускую ваенную акругу. У 1929—1933 гадах М. М. Касых — слухач ваеннан акадэміі імя Фрунзе, ваенна-паветранай акадэміі імя Жукоўскага. 3 1934 па 1942 гады служыў у Беларускай ваеннай акрўзе і на Далёкім Усходяе.

3 1942 па 1945 гады М. М. Касых — начальнік штаба, затым намеснік камандуючага 16-й паветранай арміі, у саставе якой прайшоў з баямі ад Сталінграда да Берліна, прымаў удзел у вьгзваленні Беларусі 1 горада Гомеля.

3 1945 года 1 да звальнення ў 1960 годзе ў запас займаў рад командных пасад у Ваенна-Пaverтраных Сілах краіны. У 1953 годзе закончыу ваенную акадэмію Генеральнага штаба.

Службе ва Узбросных Сілах СССР М. М. Касых прысвяціў больш 40 гадоу жыцця, прайшоў шлях ад чырвонаармейца і крамлёўскага курсанта да генерал-лейтэнанта авіяцыі.

За ратныя подзвігі М. М. Касых узнагароджан ордэнам Леніна, трыліа ордэнамі Чырвонага Сцяга, ордэнам Айчыннай ванны I ступені, двума ордэнамі Кутузава II ступені, ордэнам Чырвонай Зоркі, а таксама многімі медалямі.

Зараз М. М. Касых — персанальны пенсіянер Міністэрства абароны СССР, вядзе вялікую грамадскую работу, работу па ваенна-патрыятычнаму выхаванню моладзі.

Пётр Трафімавіч Дземчанка нарадзіўся ў 1924 годзе ў вёсцы Зарэчная Бялоўскага раёна Кемераўскай вобласці. Рускі, член КПСС з 1950 года.

Працоўную дзейнасць пачаў у 1940 годзе ў калгасе «Чырвоны сцяг» Бялоўскага раёна.

Пасля заканчэння ў 1943 годзе Тульскага ваеннага вучылішча прымаў удзел у баявых дзеяннях у саставе войск Цэнтральнага і Ленінградскага франтоў.

3 1948 па 1951 гады П. Т. Дземчанка йрацаваў намеснікам дырэктара адпой са школ горада Гродна, адказным сакратаром раённай газеты.

У 1951 —1960 гадах знаходзіўся на службе ў радах Савецкай Арміі.

3 1960 года па цяперашні час Пётр Трафімавіч Дземчанка працуе на Гомельскім заводзе вымяральных прыбораў слесарам-зборшчыкам радыёапаратуры, з’яўляецца ўдарнікам камуністычнай працы, настаўнікам моладзі, працуе з асабістым кляймом якасці. На рабочым календарь! П. Т. Дземчанкі — май 1985 года.

За працоўныя заслуг! Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР у 1974 годзе Пятру Трафімавічу Дземчанку

прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы, ён узнагароджан ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, многімі медалямі.

Пётр Трафімавіч Дземчанка — член Цэнтральнага Камітэта Кампартыі Беларусі, депутат Вярхоўнага Савета БССР IX—X скліканняў, намеснік Старшыні Вярхоўнага Савета БССР, член бюро абласнога камітэта Камуністычнай партыі Беларусі.




У СЛАЎНАЙ КАГОРЦЕ — НОВЫЯ ІМЁНЫ

Яшчэ два вельмі паважзныя чалавекі сталі ганаровымі грамадзянамі Гомеля. У сувязі з гэтым паззўчора на чарговай сесіі гарадскога Савета народных дэпутатаў адбыўся ўрачысты цырыманіял. Дружнымі эпладысментамі сустрэла зала прыехаўшага да нас жаданага госця — слаўна-га савецкага военачальніка, зараз персанальнага пенсіянера Міністэрства абароны СССР Міхаіла Макаравіча Касых і Героя Сацыялістычнай Пра цы, члена ЦК Кампартыі Беларусі, дэпутата Вярхоўнага

Савета БССР, намесніка Старшыні Вярхоўнага Савета рэспублікі, члена бюро абкома КПБ, слесара-зборшчыка Гомельскага завода вымяральных прыбораў Пятра Трафі мавіча Дземчанку.

Старшыня выканкома гзрсавета Ю, А. Самборскі сардэчна павіншаваў М. М. Касых і П. Т, Дземчанку э прысваеннем ім звання ганаровэга грамадзяніна Гомеля, расказаў удзельнікам сесіі аб іх слаўным жьщцёвым шляху.

І вось наступілі самыя хвалюючыя мінуты: Ю. А. Самборскі ўручае віноўнікам урачыстасці Дыпломы ганаровых грамадзян горада Гомеля, павязвае ім стужкі Гонару і пзведамляе, што яны занесены ў Кнігу ганаровых грамадзян нашага горада. Грымяць апладысменты. У іх — глыбокая ўдзячнасць гамяльчан за ратныя і працоўныя заслугі М. М. Касых і П. Т. Дземчанкі, за іх вялікую грамэдскую работу Міхаіл Макаравіч Касых і Пётр Трафімавіч Дземчанка выказалі сваё шчырае прызнанне за высокую ацэнку іх дзейнасці, за прысваенне такога ганаровдга звання.